Болбас, В. С. Ідэі абшчыннасці і індывідуалізму ў гісторыі педагагічнай думкі Беларусі / [В. С. Болбас] // Фарміраванне асобы студэнтов і школьнікаў на аснове духоўных каштоўнасцей грамадства : матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мінск : БДПУ імя М. Танка, 1996. – С. 42–44.

# ІДЭІ АБШЧЫННАСЦІ І ІНДЫВІДУАЛІЗМУ Ў ГІСТОРЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ

Фундаментальная распрацоўка выхаваўчых праблем як і сурьёзныя змены ў арганізацыі выхавання падрастаючага пакалення не могуць без іх глыбокага гісторыка-педагагічнага асвятлення. Таму ўсё каштоўнае, набытае шматвякавым выхаваўчым вопытам краін і народаў, дасягненні асобных дзеячоў педагагічнай і грамадскай думкі, якія вытрымалі праверку часам, павінны не толькі беражліва захоўвацца, але і актыўна выкарыстоўвацца педагагічнай навукай і практыкай.

Асабліва каштоўнае значэнне маюць набыткі нацыянальнай педагагічнай думкі, тым больш, што ў гісторыі кожнага народа можна знайсці перыяды пэўным чынам падобныя між сабой. Так з сеняшнімі часінамі нашага жыцця пераклікаецца перыяд гісторыі Беларусі эпохі Адраджэння, калі таксама адбывалася рэвалюцыя ў поглядах на прадназначэнне чалавека на зямлі, разбураліся ўстаяўшыяся стэрэатыпы светапогляду.

Характэрна, што ў свой час рэнесансавывыя павевы Захаду мелі значны ўплыў на фарміраванне светапоглядных уяўленняў. Як яны праламляліся ў свядомасці беларускага народа, разгледзім на прыкладзе яго адносін да такіх асноватворных катэгорый сацыяльнага жыцця ўвогуле і выхавання ў прыватнасці, як індывідуальнасць і абшчыннасць.

Гістарычна склалася так, што праблемам этычнага зместу зямнога жыцця нашы прашчуры надавалі вельмі важнае значэнне. Аспаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях значна ўмацоўвала ў свядомасці беларускага народа прыярытэтнасць духоўных каштоўнасцей. Кірыла Тураўскі сцвярджаў, што для чалавека нічога не можа быць вышэй, чым духоўная прыгажосць. Пытанні маральна-выхаваўчай тэматыкі да сярэдніх вякоў набываюць першараднае значэнне ў грамадскай і педагагічнай думцы Беларусі. Цікава адзначыць, што над этыка-педагагічным вуглом бачання прыпадносяцца нават вельмі далёкія ад гэтых праблем творы. Папулярныя ў Еўропе выданні “Фізіялогія”, “Шасцідневы”, якія адпавядаюць аб жывельным свеце, у нас на радзіме мяняюць курс з заалагічнага на нораванавучальны. Паказваецца, як вялікая рыба паядае малую, падобна багатым, што прыгнятаюць бедных, пчолы прыпадносяцца як узор працавітасці. Акцэнтуецца ўвага на ролю бацькоў у выхаванні дзяцей, тым самым чытачам даецца павучальны ўрок маральнасці. Прычым вышэйшым крытэрыям размежавання дабра ад зла, маральнага ад

амаральнга лічылася карыснаснасць для грамадства. Усенаглынаючы аскетызм сярэдневечча ўсталеўваў думку аб неабходнасці наўмыснага адрачэння ад індывідуальных даброт, індывідуальнага шчасця дзеля агульнага дабра.

Рэнесансава-гуманістычныя інтанацыя эпохі Адраджэння нарадзіла ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе небывалы ўзлёт ідэй індывідуалізму. У гэтым накірунку погляды еўрапейскіх гуманістаў ішлі нават уразрэз з хрысціянскім веравучэннем. Вера ў людзей, іх магчымасці, узвелічэнне кожнай асобы ўздымала кожнага індывіда на небывалую дагэтуль вышыню. Любоў да чалавека амаль што дасягала любві да Бога, а ў асобных мысліцеляў нават і пераўзыходзіла яе. Падобнымі ідэямі была прасякнута і педагагічная думка еўрапейскіх краін.

З некаторым спазненнем еўрапейскі рэнесансавы рух дакаціў свае хвалі да беларускіх зямель. Адным з першых яго праваднікоў быў Ф.Скарына. Найвялікшая яго заслуга заключаецца ў тым, што ён зрабіў спробу еўрапейскія рэнесансавыя ідэі сінтэзаваць з асаблівасцямі светапогляду свайго народа. Гуманізм Ф.Скарыны – гэта ў значнай ступені хрысціянізаваны гуманізм заходнееўрапейцаў. Асветнік прапануе з аднаго боку скіраваць выхаваўчыя намаганні на фарміраванне асобы, якая б бачыла сэнс свайго жыцця служэнню “пожитку посполитому”. З другога боку, ён падкрэслівае значнасць кожнага індывіда для грамадства і жадае, каб кожны чалавек і ўсе людзі “добре жили на свете”.

Пошукам прымірэння імкненняў да агульнага дабра і ўласнага шчасця прасякнуты ідэі М.Гусоўскага, С.Буднага, Я.Намыслоўскага, В.Цяпінскага, С.Полацкага і іншых мысліцеляў Беларусі эпохі Адраджэння. М.Гусоўскі ўзорам арганізацыі супольнага жыцця лічыў зубрыны статак, дзе пануе прынцып: “Кожны – за гурт, гурт – за кожнага”. Я.Намыслоўскі слушна адзначаў, што грамадства заўсёды павінна памятаць, што прырода схіляе кожнага індывіда да ўласных дзеянняў. С.Полацкі засяроджваў увагу на погляды Арыстоцеля наконт чалавека як істоты “содружной”.

Падобныя падыходы замацоўваліся і ў народнай педагогіцы Беларусі. Да асноўных выхаваўчых формул, што скіроўвалі фарміраванне асобы ў напрамку падпарадкавання асабістых намкненняў і інтарэсаў на службу агульнаграмадскіх, дабаўляюцца пастулаты, якія павінны былі ўсталёўваць у людзей пачуццё ўласнай годнасці, узвышэнне асабістага “Я”.

Такім чынам, адметнай асаблівасцю этнапедагогікі беларусаў з’яўляецца тое, што айчынныя этнапедагагічныя ідэі ў параўнанні з поглядамі заходнееўрапецаў вызначаюцца большай скіраванасцю да супольнасці, да абшчыннасці, да агульнага дабра. Нават такі пераломны перыяд як эпоха Адраджэння, з яе сцвярджэннем ідэй індывідуалізму, на беларускіх землях не дасягнула ў гэтым напрамку таго ўзроўню, да якога яна ўзнялася ў Цэнтральнай і аходняй Еўропе. Асноватворныя пастулаты народнай педагогікі “дазволілі” не толькі абазначыць інварыянтнасць дасягнення ўласнага шчасця, уласнай

дасканаласці, але абавязкова ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра.

Арганізатарам выхаваўчага працэсу і тым, хто займаецца ўладкаваннем дзяржавы, трэба мець на ўвазе гэтую асаблівасць менталітэту беларусаў, што ніколькі не азначае, што мы не павінны ўлічваць вопыт іншых краін у арганізацыі вырашэння падобных пытанняў. Але некрытычныя погляды на Захад, бяздумнае капіраванне чужых набыткаў наўрад ці прынясе станоўчы вынік. Гінертрафіраванае разуменне індывідуалізму – гэта якраз адзін з найбольш слабых бакоў заходняга ладу сучаснага жыцця.

Мы павінны ўзяць на ўзброенне мудрасць нашых продкаў і знайсці такія варункі вырашэння гэтай праблемы, каб дабіцца мажліва большай гарманізацыі асабістага і грамадскага. Улічваючы асаблівасці айчынных этнапедагагічных ідэй і сучасныя накірункі развіцця цывілізацыі, мы абавязаны ўтылітарныя, геданістычныя падыходы вызначэння сэнсу чалавечага жыцця сумясціць з арыентацыяй індывіда да агульнага дабра.

У гэтым напрамку выхавання падрастаючых пакаленняў мы маем даволі трывалы падмурак. Па-першае, як адзначана вышэй, вялікую дапамогу могуць аказаць глыбінныя ідэі нацыянальнай педагогікі. Па-другое, патрэбна асэнсавана, разважліва і крытычна выкарыстаць напрацоўкі педагогікі савецкага перыяду, у прыватнасці, ідэі калектывізму. Добры плён, як у тэарэтычных распрацоўках, так і ў практычным ажыццяўленні выхаваўчага працэсу павінна прынесці выкарыстанне набыткаў хрысціянскай этыкі.

Такі падыход не дазволіць парушыць пераемнасці ў выхаванні нават у самыя пераломныя перыяды грамадскага развіцця, што ўжо само па сабе значна зменшыць разбуральныя вынікі сённяшняй бездухоўнасці.